Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"
Факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці
Кафедра педагогікі сацыякультурнай дзейнасці

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедры | Дэкан факультэта |
| _________Л.І.Казлоўская | __________А.Н.Стельмах |
| "___"_____________20__ | "___"___________20___ |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# РЭГІЯНАЛЬНА-ЛАКАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

для спецыяльнасці
другой ступені вышэйшай адукацыі (магістратура)
1-08 80 07 – Сацыяльна-культурная дзейнасць

Складальнік:

Н.В.Сівіцкая, дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКІМ, кандыдат філалагічных навук

Разгледжана і зацверджана
На пасяджэнні Прэзідыума Навукова-метадычнага савета
(пратакол № 3 ад 19.11.2019 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнік:
*Сівіцкая Н.В., дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці БДУКІМ, кандыдат філалагічных навук*

Рэцэнзэнты:
*А.А.Гурэцкі*, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных навук УА “Беларуская дзяржаўная акадэмія авіяцыі”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.
*А.І.Шаблоўскі*, загадчык кафедры беларускай і рускай моў УА “Беларукі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

Разгледжаныі рекамендаваныда сцвярджэння:
*Кафедрай педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол №12 ад 27. 06.2019 г.)*

*Саветам факультэта культуралогііі сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстановы адукацыі«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (протокол № 1 от 30.08.2019 г.)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА…………………………………………....... | 4 |
| 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ……………………………………………… | 5 |
| 2.1 Канспект лекцый …………………………………………………….. | 5 |
| 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ……………………………………………….. | 14 |
| 3.1. Тэматыка практычных заняткаў………………………………………<br>4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ……………………………………..... | 16<br>16 |
| 4.1Пытанні да заліку ……………………………………………………. | 16 |
| 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ …………………………….......................... | 17 |
| 5.1 Вучэбная праграма……………………………………………….......... | 17 |


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Веданне лакальна-рэгіянальных асаблівасцей СКД з’яўляецца актуальным у кантэксце прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыякультунай сферы.

Лакальна-рэгіянальныя асаблівасці СКД – гэта гульні, абрады, міфалогія, частка з якіх з’яўляеца нематэрыяльнай культурнай спадчынай Беларусі, іх значнасць падкрэслена ў “Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі” – як адзін з фактараў захавання нацыянальнай самаідэнтычнасці і супрацьстаяння знешнім пагрозам.

У рамках прапанаванага курса вывучэнне лакальна-рэгіянальных асаблівасцей СКД будзе праводзіцца ў параўнальна-гістарычным аспекце. Будзе задзейнічаны шырокі славянскі і неславянскі кантэкст, што набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах поліэтнічнага грамадства і пранікнення тэндэнцый выкарыстання замежных выхаваўчых методык. Прапанаваны матэрыял паслужыць базай для распрацовак у галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці, для стварэння арыгінальных аўтарскіх сцэнарыяў сямейных і каляндарных свят.

Вучэбная дысцыпліна пабудаваны на грунтоўным факталагічным матэрыяле, значная частка якога была сабрана аўтарам падчас дыялекталагічных экспедыцый (з 1999 года па гэты час). Таксама выкарыстаны сучасныя распрацоўкі беларускіх вучоных-этнолагаў, што займаліся дадзенай праблемай.

*Мэта:* азнаямленне магістрантаўтэарэтычным і практычным матэрыялам вучэбнай дыясцыпліны.

*Задачы:*

- азнаёміць магістранаў з лекцыйным матэрыялам;
- увесці ў карыстанне рэкамендуемую літаратуру;
- азнаёміць з сістэмай кантролю ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

2.1. Канспект лекцый

### *Тэма 1. Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры рэгіёнаў Беларусі (4 гадзіны).*

Паводле этнаграфічнага размеркавання Беларусь складаецца з 6 рэгіёнаў, кожнаму з якіз уласцівы ўнікальныя асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры.

У адпаведнасці з гістарычнымі, этнакультурнымі і лінгвістычнымі крытэрамі на тэрыторыі Беларусі вылучаецца шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: Паўночны (Паазер'е), усходні (Падняпроўе), Цэнтральны, паўночна-заходні (Панямонне), Усходняе Палессе і Заходняе Палессе. Вялікую ролю ў фарміраванні гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі згулялі сацыяльна-эканамічныя фактары. Межы гісторыка-этнаграфічных арэалаў блізка суадносяцца з межамі асноўных дыялектаў беларускай мовы. З сучасным адміністрацыйным дзяленнем этнаграфічныя рэгіёны суадносяцца наступным чынам:

1. Паўночны (Паазер'е) - тэрыторыя Віцебскай вобласці (акрамя Дубровенскага, Аршанскага і Талачынскага раёнаў), а таксама частка паўночных раёнаў Мінскай вобласці.

2. Усходні (Падняпроўе) - Дубровенскі, Аршанскі і Талачынскі раёны Віцебскай вобласці, асноўная частка Магілёўскай вобласці (без Глускага, Бабруйскага і Асіповіцкага раёнаў) і ўсходняя (да Дняпра) частка Гомельскай вобласці.

3. Цэнтральны-тэрыторыя ў цэнтры Рэспублікі. У асноўным гэта Мінская вобласць, тры раёны (Глускі, Бабруйскі і Асіповіцкі) Магілёўскай вобласці і Баранавіцкі і Ляхавіцкі раёны Брэсцкай вобласці.

4. Паўночна-заходні (Панямонне) - у асноўным тэрыторыя Гродзенскай вобласці.

5. Усходняе Палессе-астатняя частка Гомельскай вобласці, заходняя ўскраіна Брэсцкай вобласці і паўднёва-заходняя ўскраіна Мінскай вобласці.

6. Заходняе Палессе-асноўная частка Брэсцкай вобласці (без Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў).

### *Тэма 2 Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Паазер’я (2 гадзіны)*

Беларускае Паазер’е ахоплівае Віцебшчыну і часткова паўночныя раёны Мінскай вобласці. У гэтым гісторыка-этнаграфічным рэгіёне вельмі маляўнічы, узгорысты рэльеф. Узгоркі, парослыя змешаным лесам, чаргуюцца тут з забалочаннымі нізінамі, якія перасякаюць шматлікія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэчышчы, і старажытнымі катлавінамі, што ўтвараюць гірлянды маляўнічых азёр. Гэта абумовіла асаблівасці сельскіх паселішчаў Паазер'я, для якіх характэрна маладворнасць і бессістэмнасць забудовы.

У структуру музейнай паазерскай вёскі з бессістэмнай планіроўкай уваходзяць культавыя пабудовы, паазерскія вяночныя двары-комплексы, пабудовы прыгумення, малыя архітэктурныя формы.

Гульні і забавы Паазер'я.

"Жаніцьба Цярэшкі" - калядная гульня Паазер'я. Паходжанне назвы гульні. Ідэя правядзення ў старажытнасці і яе трансфармацыя ў позні час. Падрыхтоўчы этап да гульні. Дзеючыя асобы гульні і іх функцыі. Драматургія гульні.

"Зязюля" - старажытная гульня. Сэнс гульні, яе змест. Разнастайнасць калядных гульняў і карагодаў: "Яшчур", "Халімон", "Кралька", "Падушачка", "Я еду бел маладзец", "Царыў сын каралёў", "Чарнец", "Мак", "Гусачок", "Канапелькі" і інш.

Міфалогія Паазер'я.

### *Тэма 3. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Падняпроўя (2 гадзіны)*

Адным з такіх старажытных святаў з'яўляецца ***Камаедзіца.*** Гэты святочны тыдзень пасля вясенняга раўнадзенства адзначаўся на прасторы ўсёй Усходней Еўропы, а спасылкі на падобные абрады існуюць таксама ў азіяцкіх і паўднева-еўрапейскіх краінах. Па некаторых вытоках Камаедзіцай завецца першы альбо апошні дзень гатэга тыдня. Пазней жа, гэта паганскае свята прыстасавалі да хрысціянскага паста, каторы надараецца кожны год у розны час. Але найболш лагічным часам дзеля камаедзіцы лічыцца менавіта тыдзень пасля раўнадзенства, як адпавядаючы ўсім уласцівым для гэтага свята рысам.

Лейтматывам *Камаедзіцы* праходзіць святкаванне абуджэння прыроды, нараджэння новага лета. Людзі радаваліся, што перажылі яшчэ адну зіму, развітваліся з ей, як з надакучлівай госцей. Не гледзячы на падцягнутые за зіму падпругі, знаходзіліся і ставіліся на стол лепшые стравы, пякліся аладкі, шчодра аздобленые медам, алеем і свінным салам, рэпа, аўсяны кісель, гарохавая каша... Кожная страва мела свае асаблівае значэнне. Круглые, гарачые, жоўтые і бліскучые аладкі ды бліны ўвасаблялі сабой сонца, якое нарэшце "павярнулася на дзень" і цяпер з кожным разам будзе свяціць і грэць усе больш і больш. Сонцу радаваліся, яму пакланяліся, яго маленькіе ўвасабленні з асалодай і радасцю елі, частавалі суседзяў ды сваякоў, а першы блін ахвяравалі багам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гарохавая каша таксама лічылася неабходным атрыбутам святочнага застолля, бо яна, як меркавалі продкі, была любімым ласункам мядзьведзя, якога вельмі шанавалі ў старажытнасці. На мядзьведзі патрэбна спыніцца асобна. Гэтага звера, жыхара неабсяжных лясоў, які мог хадзіць на дзвух лапах, есці як мяса, так і раслінную ежу, людзі лічылі сваім продкам і татэмам. Мядзьведь з'яўляўся адным з увасабленняў бога **Велеса**, пакравіцеля хатніх жывел, таго свету ды чалавечай сэксуальніасці. Мядзьведзю надаваліся незвычайные ўласцівасці, яму пакланяліся і прыносілі дарункі. І, канечне, не маглі абысці яго ўвагай і на гэты раз - тым больш, што як раз у гэты час мядзьведзь прачынауся ад спячкі, зусім як увесь свет і разам з ім чалавек, скідваў са сваіх плячэй зімовые путы. Каб заручыцца спагадлівасцю мядзведзя, у лес яму насілі пачастункі - тую самую гарохавую кашу, якая часта зліпалася у камы. Гэтые камы, верагодна, і далі назву усяму святу - "камаедзіца" - "камы есці".

Паводле іншай версіі, "кам" - старажытная назва гаспадара, такім жа словам маглі называць і мядзьведзя, якому пакланяліся як гаспадару лесу.

Пасля абеду і частаванняў лічылася істотным "пакачацца" з боку на бок, як мядзьведзь у бярлозе, каб яму лягчэй прачыналася, каб быў ён лагодны ды шкоды людзям не рабіў. Пазней гэтыя качанні ператварыліся ў вяселыя забавы на свежым паветры, калі моладзь "качала" адзін аднаго ў гурбах, кідалася снегам ды каталася з гор (кубарам альбо, пазней, на санках).

Абрад “Провады русалкі” звязаны з заканчэннем святкавання на восьмым тыдні пасля Вялікадня Русальнага тыдня, праводзіцца штогод у нядзелю пасля Тройцы.

Удзельнікі традыцыйнага абраду (практычна ўсё насельніцтва вёскі Вялікі Бор) апранаюцца ў святочнае адзенне, плятуць вянкі, рыхтуюць кветкі і ідуць вялікім ходам праз усю вёску з выкананнем абрадавых песень на ўскрек вёскі да поля – праводзяць Русалку (звычайна маладую незамужнюю дзяўчыну), каб прагнаць яе ў жыта, асвяціць сарваную з яе зеляніну і вянок, павадзіць карагоды і паскакаць праз вогнішча.

Абрадавая дзея звязана з спецыяльнымі абрадавымі атрыбутамі: касцюмам, вялікім і маленькімі абрадавымі вянкамі, якія “ачышчаюць” і “асвячаюць” над полымем, разрываюць і раздаюць жыхарам і ўсім прысутным на добры ўраджай.

Абрад “Провады русалкі” з’яўляецца актуальнай культурнай з’явай, перадаецца з пакалення ў пакаленне і прызнаецца вясковай супольнасцю каштоўнасцю. Жыхары вёскі Вялікі Бор, бліжэйшых вёсак, раённага цэнтра з’язджаюцца штогод, каб прыняць удзел у традыцыйным абрадавым дзеянні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзеці і ўнукі старэйшых жанчын-носьбітаў ведаюць гісторыю ўзнікнення свята, дапамагаюць сваім матулям і бабулям у час абраду.

### *Тэма 4. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Цэнтральнага рэгіёна (2 гадзіны)*

Здавён захаваўся звычай абыходзіць вёску з каляднымі песнямі, віншаваннямі, найлепшымі пажаданнямі. Каталікі хадзілі 25 снежня і на Вадохрышча – абрад называўся «Тры каралі». Праваслаўныя – у першы або таксама і на другі дзень Ражаства, на Шчодры вечар 13 і раніцай 14 студзеня. У розных месцах абыходы называліся па-рознаму: «у казлы хадзіць», калядаваць (на Ражаство) або шчадраваць (на Шчодры вечар), «у шчадрухі хадзіць» (як правіла, гэта быў жаночы гурт спявачак), «хадзіць з Калядою (або па Калядзе)», «хадзіць з батлеяй». Абрад «Шчадрэц» з вёсак Рог і Восава Салігорскага раёна – пад аховай дзяржавы. А такая берасцяная маска – магчыма, адзіная ў Еўропе, што захавалася ў жывым абрадзе. Калядны карнавал Міншчыны багаты і разнастайны, тут захоўваюцца ўзоры ўсіх асноўных калядных традыцый Беларусі. Тры віды абрадаў Міншчыны маюць статус нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў, а яшчэ напагатове традыцыйная абрадавая гульня «Ката пячы». Пад ахову дзяржавы ўзяты абрад «Шчадрэц» з вёсак Рог і Восава Салігорскага раёна, з вёскі Новіны Бярэзінскага раёна – абрад «Цягнуць Каляду на дуба», прысвечаны заканчэнню калядных святкаванняў, а «Калядныя Цары» з Семежава Капыльскага раёна знаходзяцца пад аховай ЮНЕСКА. Абрад адноўлены ў 1997 годзе мясцовымі хлопцамі – вучнямі і выпускнікамі школы, і з таго часу пастаянна дапаўняецца, дзякуючы ўспамінам мужчын старэйшага пакалення, якія спраўлялі гэты абрад у маладосці.

У вёсках Рог і Восава Салігорскага раёна прытрымліваюцца класічнай палескай традыцыі ваджэння Дзедам і Бабай Казы, Каня, Жураўля. У гурце абавязкова ходзяць і Цыган з Цыганкай, Механоша і Звяздар, шчадрухі-спявачкі і музыканты.

Аднак на Міншчыне існаваў і калядны карнавал, і свая традыцыя ігрышча, што адрозніваецца ад «Жаніцьбы Цярэшкі». Гэта ігрышча «Ката пячы». У розных раёнах Міншчыны спраўлялі яго на Каляды і часам нават перад Вялікім постам. Зараз жывую традыцыю захоўваюць у аграгарадку Скірмантава Дзяржынскага раёна мясцовыя калектывы «Сваякі» і «Весялухі», аснова якіх – род Рэдзько з вёскі Грынкевічы. Першы раз збіраюцца перад Піліпаўкай, 27 лістапада, на вячэру ў складчыну. Танцы, гульні, песні і жартачкі гучаць, пакуль пячэцца Кот – адмысловае фігурнае печыва ў выглядзе частак цела ката, якія пэўным чынам мацуюць паміж

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

сабой і падвешваюць да столі насупраць покуці. Нясуць урачыста: «Ад печы да кута нясём лысага Ката!» Едуць да Ката на вілках, кажучы: «Ад парога да кута еду да лысага Ката. Цап за Ката!» Смяяцца і хапаць печыва рукамі нельга, хоць астатнія стараюцца рассмяшыць гульца. Хвост у Ката з каўбасы, і хто зможа пад'ехаць да яго, падскочыць і адкусіць хвост – атрымае печыва, каб падзяліць паміж усімі прысутнымі. Падчас дзяльбы Ката кажуць: «Даю табе кавалачак са спінкі, каб у цябе добра вяліся свінкі, а табе – лапку, каб не любіў чужую бабку…»

Печыва абавязкова было ў выглядзе ката. Пэўна, у даўнія часы існаваў нейкі міфалагічны вобраз або татэм, якому ахвяравалі пірог з выявай ката, а наступная дзяльба азначала надзяленне кожнага шчаслівай доляй у шлюбе.

21 студзеня тыя, хто шчадраваў на стары Новы год, праводзяць абрад «Цягнуць Каляду на дуба». Каляда – абмалочаны зажыначны снапок у выглядзе жаночай іпастасі. Яго вязуць на санчаках да дуба, што адзінока стаіць у полі. Каб да наступнага лета зберагаў пасевы і спрыяў добраму ўраджаю. На дуб усцягваюць драўлянае кола – каб буслы вяліся. А накола ставяць гліняны гаршчок з кашай-куццёй – ахвяру душам продкаў. Пасля абраду ладзіцца сумесная пагулянка ў складчыну. Танцы, музыка, спевы да позняга вечара. Для вёскі і ўсёй Бярэзіншчыны гэта самае адметнае свята. Яго адрадзіла Ніна Клімовіч у 1998 годзе. Усім родам яны трымаюць традыцыю абраду, які некалі праводзіўся ў вёсках Бярэзінскага раёна.

### *Тэма 5. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Панямоння (2 гадзіны)*

Адным з самых значных веснавых святаў у рэгіёне з'яўляецца Юр'я (святкуецца 6 мая згодна праваслаўнай традыцыі). Як піша А.С. Ліс, на Юр'я выконваліся два асноўныя комплексы ахоўна-магічных па сваіх мэтах абрадаў: адзін, звязаны з выганам жывёлы на "Юр'еву расу", скіраваны на захаванне статка ад дзікіх звяроў, хвароб і сурокаў, другі насіў чыста аграрны характар і здзяйсняўся дзеля добрага росту збажыны і аховы пасеваў. У раёне Шчучына, Ліды, Жалудка юраўскія абрады насілі абходны характар, адзначалася таксама наведванне маладзіцы на першым годзе яе замужжа (семантычна падобныя абрады ў іншых традыцыях прымеркаваны да Масленіцы). Апошнім значным веснавым святам лічылася Сёмуха (Тройца, Зялёныя сяткі). Для позневеснавой традыцыі рэгіёна характэрна адсутнасць русальных абрадаў і самога тэрміна "русальны тыдзень" (наступны пасля Тройцы тыдзень), а самі ўяўленні пра русалак вельмі неадназначныя і фіксуюцца рэдка(Т.І.Кухаронак і В.І. Басько). З панядзелка другога тыдня пасля Пяцідзесятніцы у праваслаўных пачынаецца Пятроў пост (ці Пятроўка) – пачатак сенакосаў. Адным з апошніх позневеснавых святаў з'яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзевятнік (Зелянок ці Божа Цяло), у каталіцкай традыцыі прымеркаваны да ўрачыстасці Найсвяцешага Цела і Крыві Хрыста і адзначаецца ў чацвер пасля Найсвяцейшай Тройцы. Да сённяшняга дня захавалася традыцыя асвячэння на Дзевятнік дзевяці вяночкаў з зёлак. Вянкі гэтыя выкарыстоўваліся потым у якасці ахоўнага альбо лекавага сродка. Купалле, Пятро, Ілля, а таксама жніўныя абрады (зажынкі, дажынкі) складаюць летнюю групу святаў.

Адметнасцю Купалля на Панямонні даследчыкі лічаць наяўнасць кампанентаў абраднасці, ў большай ступені звязанай з культам вады і расліннасці, і ў меньшай – з культам агню.

Найбольшым патэнцыялам у гэтых адносінах валодае, безумоўна, каляндарная абраднасць з выразна аформленымі мастацкімі элементамі. Да гэтай групы належаць абрады ўсяго каляднага цыкла, уключаючы само калядаванне, святкаванне Новага года (Шчадрэц), Вадохрышча (Тры Каралі), што суправаджаюцца звычайна маскарадамі, адпаведнымі песнямі, тэатралізаванымі прадстаўленнямі, у тым ліку і батлеечнымі, спецыяльнай абрадавай ежай. Традыцыйныя вячоркі, што ладзіліся ў гэты час, валодаюць бадай што найбольшым патэнцыялам сярод усіх абрадавых элементаў для стварэння анімацыйных праграм, так як менавіта гэтыя вячоркі суправаджаліся тымі танцамі, спевамі, гульнямі тыпу “Яшчар”, “Жаніцьба Цярэшкі”, “Ката пячы”, якія атаясамліваюцца звычайна з уяўленнем пра традыцыйныя беларускія вячоркі.

***Тэма 6. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Усходняга Палесся (2 гадзіны)***

Гуканне вясны. Гэтае свята характэрна для Усходняй Беларусі. Як і масленкавыя абрады, песні і карагоды адбываліся на горках, бо так было бліжэй да неба. Кульмінацыя свята дасягалася 7 красавіка, калі адбываліся непасрэдна рытуальныя дз еянні і працягваліся да таго моманту, як узаруць поле. Саракі . Свята прыпадае на 22 сакавіка. Яно адзначае дзень вяснов ага раўнадзенства. З гэтым святам канчаткова прыходзіць вясна. Вялікдзень . Свята лічыцца найвялікшым каляндарным святам. Яно скл адае выключную адметнасць, самабытнасць беларускага абрадава-святочн ага каляндара. На гэтае свята сутракалі Новы Год па сонечнаму календару. Святкавалася ў дзень в ясновага раўнадзенства. Потым стала перасоўным ад 4 красавіка да 8 мая. Апошняя нядзеля перад с вятам была Вербная нядзеля. У царкву неслі галінкі вярбы, якія асвячалі святой вадой. Наўскі Вялікдзнь . Адзначаўся ў чысты чацвер, як частка агульнакаляндар най традыцыі ўшанавання дзядоў. Гэтае свята больш вядома пад назвай Радаўніца - свята ўшанавання памерлых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Старажытны народны абрад, які здаўна спраўляўся на Гомельшчыне, па захадзе Браншчыны (дзе жылі этнічныя беларусы) і на паўночным усходзе Украіны. Суправаджаўся песнямі, карагодам і пахаваннем ”стралы” - грошэй, лялькі або металічнага прадмета. Правозіўся з мэтай выклікаць дождж і надаць зямлі ўрадлівасць. Мае язычніцкае паходжанне і, верагодна, у старажытнасці спраўляўся ў гонар Пяруна - бога маланак. Уласна ”страла” ў даўніну азначала менавіта маланку. Пасля ”Пахавання” лічылася, што вясна ўжо скончылася, і спяваць веснавыя песні болей было нельга. Штогадовы абрад «Пахавання стралы», што і сёння праводзіцца ў вёсцы Казацкія Балсуны, занесены ў Спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі.

***Тэма 7. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Заходняга Палесся (2 гадзіны)***

Вясельны каравай – гэта сімвал дабрабыту і шчасця маладой сям’і. Па сённяшні час у вёсцы Моталь захоўваецца старадаўні звычай выпечкі, упрыгожвання і міжродавага падзелу абрадавага хлеба – каравайная традыцыя.

Менавіта, з выпечкі каравая пачынаецца вяселле. Для гэтага спецыяльна запрашаюцца жанчыны-каравайніцы, абавязкова шчаслівыя ў шлюбе, бо лічыцца, што яны могуць сваёй энэргетыкай паўплываць на лёс маладых, перадаць ім сваю долю.

Каравайная частка вясельнага абраду ўключае ў сябе шэраг адказных чынаў: расчыненне, замес, гібанне, сажанне ў печ, выйманне з печы, упрыгожванне, а таксама выкуп і падзел. Кожны этап суправаджаецца адмысловымі дзеяннямі, каб “запраграмаваць” добры шлюб. Спецыяльным упрыгожваннем для каравая з’яўляюцца “шышкі” – галінкі садовых дрэў, і “барылца” – жгуты цеста абвітыя вакол іх па спіралі. Каравай выпякаецца ўжо ўпрыгожанным, а потым шышкі аздабляюць папяровымі кветкамі і вечназялёнымі раслінамі.

На працягу ўсяго вяселля каравай знаходзіцца ў халодным памяшканні – “каморы”, а на заканчэнне свята кожны госць адорваецца сваёй часткай, узамен на добрыя пажаданні і падарункі маладым.Да нашых дзён звяртаюцца жыхары вёскі Моталь да вясельных традыцый.

Вясновы абрадавы карагод “Стрылка”вёска Бездзеж, Драгічынскі раён, Брэсцкая вобласць**.** Штогод на першы дзень Вялікадня, у вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна, адбываецца своеасаблівы абрад, які існуе толькі ў гэтай мясцовасці. Гэта ўнікальная лакальная з’ява да якой старанна рыхтуюцца і якая з’ўляецца вельмі ўстойлівым элементам мясцовай культуры. Сутнасць вясновага абрадавага карагода “Стрылка” заключаецца ў дазволе да гулянняў пасля Вялікага паста, гэта сваеасаблівы зварот да вышэйшых сіл з надзеяй на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новы багаты ўраджай, лепшую долю, шчасце і здароў'е для малых і дарослых, для ўсіх вяскоўцаў. Пасля Вялікоднай службы ў царкве (служба ў Бездзежы называецца "Нешпар"), усе збіраюцца на плошчы ля крыжа, дзе бацюшка акрапляе ўсіх прысутных вадой, і завадатар (самая старэйшая паважаная жанчына, маючая добрую сям'ю), ставіць маленькіх дзяўчынак "зярнятак" у выглядзе трохкутніка, а астатнія ўдзельнікі карагода злучаюць рукі і рухаюцца вакол іх па сонцу, агінаючы "зярнятак" у выглядзе падковы, спяваючы карагодную песню. Адметна, што ў абрадавым карагодзе "Стрылка" удзельнічаюць толькі дзяўчаты і жанчыны.

Абрадавы карагод "Стрылка" выконвае сімвалічна-знакавую функцыю, спрыяе захаванню сваёй культурнай адметнасці і выхаванню ў новых пакаленняў паважных адносін да звычаяў продка

Ваджэнне куста" – гэта яркая рэгіянальная адметнасць траецкага свята на Брэстчыне. Дзяўчыну ці маладую жанчыну ўпрыгожвалі зялёнымі галінкамі і вадзілі па вёсцы абыходзячы ўсе двары, спявалі абрадавыя песні ў якіх славілі гаспадароў, іх дзяцей, жадалі ім здароўя і дабрабыту. "Куста" лічылася сімвалам ураджаю. З цягам часу абрад пад уплывам сацыяльна-эканамічных фактараў трансфарміраваўся і набыў шлюбную накіраванасць і стаў надзеяй і пажаданнем добрага шлюбу.

Абрад пачынаецца да абеду, калі яго ўдзельніцы (жанчыны і дзяўчаты) збіраюцца ў хаце ў адной з жанчын. З клёну робяць вянок і адзенне для Кусты. Гурт з Кустай абыходзіць вёску з святочнымі песнямі, просячы гаспадароў двароў адарыць Кусту. Гаспадары дараць хлеб, пірагі, мёд, мяса, сала, яйкі, напоі, даюць грошы, некаторыя накрываюць стол і частуюць усіх удзельніц абраду. Пасля таго, як абыход завершыцца, гурт накіроўваецца туды, дзе ўсе збіраліся перад абрадам і пакінулі прыгатаваныя дома стравы. Усе ўдзельніцы абраду імкнуцца сарваць па некалькі лісткоў з "Кусты". Завяршаюцца абрадавыя дзеі агульным святочным застоллем.

Абрад яднае пакаленні: карэнныя жыхары звязваюць гэты абрад з памяццю продкаў – ад іх ён перададзены наступным пакаленням. Штогадовае бясперапыннае ўзнаўленне на Тройцу гэтай традыцыі фарміруе ў жыхароў аграгарадка ўсведамленне, што яны з'яўляюцца адной супольнасцю якая мае адметную традыцыйную культуру.

Абрад "Намскі Вялікдзень" з'яўляецца адметным праяўленнем лакальнай культурнай традыцыі в.Аброва Івацэвіцкага раёна і праводзіцца штогод у чацвер Вялікоднага тыдня.

Першы чацвер пасля Вялікадня – асаблівы дзень для Аброва, амаль ужо стагоддзе адзначаюць яшчэ адзін Вялікдзень – Намскі, што азначае "наш", "нам дадзены". Сёння для мясцовых жыхароў гэта радасная і ўзнёслая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падзея. У дваццатыя гады мінулага стагоддзя, калі зарадзіўся гэты абрад, аброўцам было не да святаў. Пачалося ўсё з таго, што ў вёсцы сталі хварэць і паміраць дзеці. Ніхто не мог дапамагчы і не ведаў, што рабіць. І тады старыя людзі падказалі: жанчынам вёскі ноччу сабрацца ў адной хаце, напрасці нітак і саткаць з іх за адну ноч рушнік. А мужчынам у гэты час змайстраваць ківот для абраза Маці Божай, паставіць туды абраз, накрыць яго сатканым за ноч рушніком і абысці ўсю вёску па крузе, заходзячы ў кожны двор. Так і зрабілі. І здарыўся цуд: дзеці акрыялі, мор адышоў. А жыхары вёскі з таго моманту далі сабе зарок: вось так абыходзіць вёску штогод у чацвер пасля Вялікадня, і тады ліхалецце і няшчасці будуць мінаць Аброва. Таму Намскі Вялікдзень – з так званых “заветных свят”, ці аброчных дзён, якія былі ўстаноўлены па абяцанні як падзяка або аброк Богу за дапамогу жыхарам вёскі пры ўзнікненні эпідэмій, мору і іншых няшчасцяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

3.1. Тэматыка практычных заняткаў

**Тэма 2. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Паазер'я (4 гадзіны)**

***Пытанні да разгляду:***

Калядная гульня Паазер'я "Жаніцьба Цярэшкі". Паходжанне назвы гульні. Ідэя правядзення ў старажытнасці і яе трансфармацыя ў позні часы. Падрыхтоўчы этап да гульні. Дзеючыя асобы гульні і іх функцыі. Драматургія гульні.

"Зязюля" - старажытная гульня. Сэнс гульні, яе змест. Разнастайнасць калядных гульняў і карагодаў: "Яшчур", "Халімон", "Кралька", "Падушачка", "Я еду бел маладзец", "Царыў сын каралёў", "Чарнец", "Мак", "Гусачок", "Канапелькі" і інш. Шляхі і мажлівасці іх выкарыстання ў сучаснай сацыякультурнай дзейнасці

**Тэма 3. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Падняпроўя (2 гадзіны)**

***Пытанні да разгляду:***

Абрады Камаедзіца, Провады Русалкі. Гісторыя і развіццё,шляхі і мажлівасці іх выкарыстання ў сучаснай сацыякультурнай дзейнасці.

**Тэма 4. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Панямоння (2 гадзіны)**

***Пытанні да разгляду:***

Юр'я, два асноўныя комплексы ахоўна-магічных па сваіх мэтах абрадаў, Сёмуха (Тройца, Зялёныя святкі), Дзевятнік (Зелянок ці Божа Цяло), у каталіцкай традыцыі прымеркаваны да ўрачыстасці Найсвяцешага Цела і Крыві Хрыста. Адметнасці Купалля на Панямонні..Шляхі і мажлівасці іх выкарыстання ў сучаснай сацыякультурнай дзейнасці.

**Тэма 5. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Цэнтральнага рэгіёна (2 гадзіны)**

***Пытанні да разгляду:***

Абрад «Шчадрэц», калядны карнавал Міншчыны.Традыцыйная абрадавая гульня «Ката пячы», абрад «Цягнуць Каляду на дуба», «Калядныя Цары». Шляхі і мажлівасці іх выкарыстання ў сучаснай сацыякультурнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тэма 6.Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Усходняга Палесся (4 гадзіны)**

***Пытанні да разгляду:***

Гуканне вясны, Саракі, Наўскі Вялікдзнь. Абрад «Пахавання стралы».Шляхі і мажлівасці іх выкарыстання ў сучаснай сацыякультурнай дзейнасці.

**Тэма 7. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Заходняга Палесся (4 гадзіны)**

***Пытанні да разгляду:***

Мотальскі вясельны каравай, вясновы абрадавы карагод "Стрылка",ваджэнне "Куста". Абрад "Намскі Вялікдзень", шляхі і мажлівасці іх выкарыстання ў сучаснай сацыякультурнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

4.3 Прыкладны пералік пытанняў да заліку.

1. Гісторыка- этнаграфічны падзел Беларусі.
2. Легенды і паданні і іх сацыялькультурны змест.
3. Сацыякультурны патэнцыял народных былічак, вусных апавяданняў, анекдотаў, жартаў, прыкмет і павер'яў.
4. Сацыякультурны патэнцыял беларускіх народных прыказак і прымавак.
5. Калядны цыкл народнага календара беларусаў: сацыякультурны патэнцыял.
6. Веснавыя святы і абрады беларусаў і іх сацыякультурны патэнцыял.
7. Сацыякультурны патэнцыя летніх свят і абрадаў.
8. Восеньскія святы і абрады і іх сацыякультурны патэнцыял.
9. Сацыякультурны патэнцыял сямейных звычаяў і абрадаў беларусаў.
10. Шляхі выкарыстання рэгіянальных асаблівасцей сямйных і каляндарных свят у сучаснай СКД.
11. Абрад "стрылка" і яго сацыякультурны змест.
12. Наўскі Вялікдзень – гісторыя, развіццё і сучаснасць.
13. Сацыякультурны патэнцыял абрадаў Ваджэнне куста і Пахаванне стралы
14. Мотальскі вясельны каравай – традыцыя і сучаснасць
15. Сацыякультурны патэнцыял свята Саракі
16. Гуканне вясны – гісторыя і сучаснаць
17. Сацыякультурны патэнцыял гульняў "Жаніцьба Цярэшкі" і "Ката пячы"
18. Юр'я – гісторыя, развіццё і сучаснаць
19. Провады русалкі – сацыякультурны змест
20. Абрады Шчадрэц і Калядныя цары – гісторыя і сацыякультурны змест.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

УЗГОДНЕНА
Прарэктар па навуковай
рабоце БДУКМ
_______________ В.Р.Языковіч
20.06.2019
Рэгістрацыйны № УД-118/эвуч.

**РЭГІЯНАЛЬНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці II ступені вышэйшай адукацыі*
*(магістратура)*
*1-08 80 07 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2019 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыіОСВО 1-088007-2019 і вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-088007 Сацыяльна-культурная дзейнасць, рэгістрацыйны №В08-2-16/уч.

СКЛАДАЛЬНІК:

*Н.В.Сівіцкая*, дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат філалагічных навук

РЭЦЭНЗЕНТЫ

*А.М.Сяргеева*, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнай навуковай установы “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі кандыдат філалагічных навук, дацэнт;

*І.У.Капцюг*, дацэнт установы адукацыі “Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

*Кафедрай педагогікі сацыякультурнай дзейнасці* ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 10 ад 29.05.2019);
*Прэзідыумам навукова-метадычнага савета* ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №5 ад 12.06.2019)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за выпуск: *Н.В.Сівіцкая*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Веданне лакальна-рэгіянальных асаблівасцей СКД з'яўляецца актуальным у кантэксце прафесійнай дзейнасці спецыяліста сацыякультунай сферы.

Лакальна-рэгіянальныя асаблівасці СКД – гэта гульні, абрады, міфалогія, частка з якіх з'яўляеца нематэрыяльнай культурнай спадчынай Беларусі, іх значнасць падкрэслена ў "Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі Беларусі" – як адзін з фактараў захавання нацыянальнай самаідэнтычнасці і супрацьстаяння знешнім пагрозам.

У рамках прапанаванайвучэбнай дысцыпліны вывучэнне лакальна-рэгіянальных асаблівасцей СКД праводзіцца ў параўнальна-гістарычным аспекце.Задзейнічаны шырокі славянскі і неславянскі кантэкст, што набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах  поліэтнічнага грамадства і пранікнення тэндэнцый выкарыстання замежных выхаваўчых методык. Прапанаваны матэрыял паслужыць базай для распрацовак у галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці, для стварэння арыгінальных аўтарскіх сцэнарыяў сямейных і каляндарных свят.

Вучэбная праграма пабудавана на грунтоўным факталагічным матэрыяле, значная частка якога была сабрана аўтарам падчас дыялекталагічных экспедыцый (з 1999 года па гэты час). Таксама выкарыстаны сучасныя распрацоўкі беларускіх вучоных-этнолагаў, што займаліся дадзенай праблемай.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – азнаямленне магістрантаў з тэарэтычным і практычным матэрыялам вывучаемага курса.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны*:

- азнаёміць магістранаў з лекцыйным матэрыялам;
- вызначыць стратэгію падрыхтоўкі да практычных заняткаў;
- увесці ў карыстанне рэкамендуемую літаратуру;
- выхаваць здольнасці да крэатыўнага і крытычнага мыслення ў прафесійнай дзейнасці;
- сфарміраваць асноўныя навыкі выкарыстання народна-педагагічнай спадчыны ў практычнай дзейнасці;

сфарміраваць уменне адаптаваць этычныя, эстэтычныя каштоўнасць да сучаснай сацыякультурнай сітуацыі.

У выніку вывучэння дысцыпліны магістранты павінны *ведаць*:

- асноўныя тэарэтычныя палажэнні рэгіянальнай СКД;
- асаблівасці сакральных табу, народнага дыскурсу, канфесіянальнай эстэтыкі і г.д.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Магістранты павінны *ўмець*:

- выяўляць сацыякультурны патэнцыял беларускай абрадавай і па-за абрадавай культуры;
- выкарыстоўваць станоўчы вопыт лакальна-рэгіянальнай СКД ў педагагічнай і сацыякультурнай дзейнасці.

Магістранты павінны *валодаць*: тэрміналагічным інструментарыем вывучаемай дысцыпліны, здольнасцю практычна выкарыстоўваць атрыманыя веды, камунікатыўнымі навыкамі і культурай прафесійных зносін.

У выніку вывучэня дысцыпліны магістры павінны набыць наступныя кампетэнцыіі:

СК-2. Быць здольнымі кіраваць калектывам у сферы прафесійнай, педагагічнай і аматарскай дзейнасці на аснове нормаў сацыяльнай і этычнай адказнасці.

Вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці сацыяльна-культурнай дзейнасці” ўсяго прадугледжана 94 гадзіны, з іх 48 гадзін – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відам заняткаў: 22 гадзін – лекцыі; 14 гадзін – практычныя, 12гадзін – семінарскія.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў магістрантаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры рэгіёнаў Беларусі

Вывучаеца падзел Беларусі у адпаведнасці з гістарычнымі, этнакультурнымі і лінгвістычнымі крытэрамі на тэрыторыі Беларусі вылучаецца шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: Паўночны (Паазер'е), усходні (Падняпроўе), Цэнтральны, паўночна-заходні (Панямонне), Усходняе Палессе і Заходняе Палессе.

1. Паўночны (Паазер'е) - тэрыторыя Віцебскай вобласці (акрамя Дубровенскага, Аршанскага і Талачынскага раёнаў), а таксама частка паўночных раёнаў Мінскай вобласці.

2. Усходні (Падняпроўе) - Дубровенскі, Аршанскі і Талачынскі раёны Віцебскай вобласці, асноўная частка Магілёўскай вобласці (без Глускага, Бабруйскага і Асіповіцкага раёнаў) і ўсходняя (да Дняпра) частка Гомельскай вобласці.

3. Цэнтральны-тэрыторыя ў цэнтры Рэспублікі. У асноўным гэта Мінская вобласць, тры раёны (Глускі, Бабруйскі і Асіповіцкі) Магілёўскай вобласці і Баранавіцкі і Ляхавіцкі раёны Брэсцкай вобласці.

4. Паўночна-заходні (Панямонне) - у асноўным тэрыторыя Гродзенскай вобласці.

5. Усходняе Палессе-астатняя частка Гомельскай вобласці, заходняя ўскраіна Брэсцкай вобласці і паўднёва-заходняя ўскраіна Мінскай вобласці.

6. Заходняе Палессе-асноўная частка Брэсцкай вобласці (без Баранавіцкага і Ляхавіцкага раёнаў).

## Тэма 2 Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Паазер'я

Вывучаюцца асаблівасці Беларускага Паазер'я, якое ахоплівае Віцебшчыну і часткова паўночныя раёны Мінскай вобласці, гульні і забавы Паазер'я: "Жаніцьба Цярэшкі" - калядная гульня Паазер'я. Паходжанне назвы гульні. Ідэя правядзення ў старажытнасці і яе трансфармацыя ў познія часы. Падрыхтоўчы этап да гульні. Дзеючыя асобы гульні і іх функцыі. Драматургія гульні. "Зязюля" - старажытная гульня. Сэнс гульні, яе змест. Разнастайнасць калядных гульняў і карагодаў: "Яшчур", "Халімон", "Кралька", "Падушачка", "Я еду бел маладзец", "Царыў сын каралёў", "Чарнец", "Мак", "Гусачок", "Канапелькі" і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэма 3. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Падняпроўя

Вывучаюцца асаблівасцт Падняпроўя, лакальныя каляндарныя святы: Камаедзіца -- святочны тыдзень пасля вясенняга раўнадзенства адзначаўся на прасторы ўсёй Усходней Еўропы, а спасылкі на падобные абрады існуюць таксама ў азіяцкіх і паўднева-еўрапейскіх краінах. Па некаторых вытоках Камаедзіцай завецца першы альбо апошні дзень гатэга тыдня. Пазней жа, гэта паганскае свята прыстасавалі да храсціянскага паста, каторы надараецца кожны год у розны час. Але найболш лагічным часам дзеля камаедзіцы лічыцца менавіта тыдзень пасля раўнадзенства, як адпавядаючы ўсім уласцівым для гэтага свята рысам. Лейтматывам Камаедзіцы праходзіць святкаванне абуджэння прыроды, нараджэння новага лета. Людзі радаваліся, што перажылі яшчэ адну зіму, развітваліся з ей, як з надакучлівай госцей. Не гледзячы на падцягнутые за зіму падпругі, знаходзіліся і ставіліся на стол лепшые стравы, пякліся аладкі, шчодра аздобленые медам, алеем і свінным салам, рэпа, аўсяны кісель, гарохавая каша... Кожная страва мела свае асабліваe значэнне. Круглые, гарачые, жоўтые і бліскучые аладкі ды бліны ўвасаблялі сабой сонца, якое нарэшце "павярнулася на дзень" і цяпер з кожным разам будзе свяціць і грэць усе больш і больш. Сонцу радаваліся, яму пакланяліся, яго маленькіе ўвасабленні з асалодай і радасцю елі, частавалі суседзяў ды сваякоў, а першы блін ахвяравалі багам.

Абрад “Провады русалкі” звязаны з заканчэннем святкавання на восьмым тыдні пасля Вялікадня Русальнага тыдня, праводзіцца штогод у нядзелю пасля Тройцы.

Абрад “Провады русалкі” з’яўляецца актуальнай культурнай з’явай, перадаецца з пакалення ў пакаленне і прызнаецца вясковай супольнасцю каштоўнасцю. Жыхары вёскі Вялікі Бор, бліжэйшых вёсак, раённага цэнтра з’язджаюцца штогод, каб прыняць удзел у традыцыйным абрадавым дзеянні. Дзеці і ўнукі старэйшых жанчын-носьбітаў ведаюць гісторыю ўзнікнення свята, дапамагаюць сваім матулям і бабулям у час абраду.

Тэма 4. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Цэнтральнага рэгіёна

Здавён захаваўся звычай абыходзіць вёску з каляднымі песнямі, віншаваннямі, Абрад «Шчадрэц» з вёсак Рог і Восава Салігорскага раёна – пад аховай дзяржавы. А такая берасцяная маска – магчыма, адзіная ў Еўропе, што захавалася ў жывым абрадзе. Калядны карнавал Міншчыны багаты і разнастайны, тут захоўваюцца ўзоры ўсіх асноўных калядных традыцый Беларусі. Тры віды абрадаў Міншчыны маюць статус нематэрыяльнай культурнай спадчыны беларусаў, а яшчэ напагатове традыцыйная абрадавая гульня «Ката пячы». Пад ахову дзяржавы ўзяты абрад «Шчадрэц» з вёсак Рог

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Восава Салігорскага раёна, з вёскі Новіны Бярэзінскага раёна – абрад «Цягнуць Каляду на дуба», прысвечаны заканчэнню калядных святкаванняў, а «Калядныя Цары» з Семежава Капыльскага раёна знаходзяцца пад аховай ЮНЕСКА. Абрад адноўлены ў 1997 годзе мясцовымі хлопцамі – вучнямі і выпускнікамі школы, і з таго часу пастаянна дапаўняецца, дзякуючы ўспамінам мужчын старэйшага пакалення, якія спраўлялі гэты абрад у маладосці.

Гульня «Ката пячы». У розных раёнах Міншчыны спраўлялі яго на Каляды і часам нават перад Вялікім постам. Зараз жывую традыцыю захоўваюць у аграгарадку Скірмантава Дзяржынскага раёна мясцовыя калектывы «Сваякі» і «Весялухі», аснова якіх – род Рэдзько з вёскі Грынкевічы.

Абрад «Цягнуць Каляду на дуба». Каляда – абмалочаны зажыначны снапок у выглядзе жаночай іпастасі.

Тэма 5. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Панямоння (2 гадзіны)

Адным з самых значных веснавых святаў у рэгіёне з’яўляецца Юр’я (святкуецца 6 мая згодна праваслаўнай традыцыі). Як піша А.С. Ліс, на Юр’я выконваліся два асноўныя комплексы ахоўна-магічных па сваіх мэтах абрадаў: адзін, звязаны з выганам жывёлы на “Юр’еву расу”, скіраваны на захаванне статка ад дзікіх звяроў, хвароб і сурокаў, другі насіў чыста аграрны характар і здзяйсняўся дзеля добрага росту збажыны і аховы пасеваў. Адметнасцю Купалля на Панямонні даследчыкі лічаць наяўнасць кампанентаў абраднасці, ў большай ступені звязанай з культам вады і расліннасці, і ў меньшай – з культам агню.

Найбольшым патэнцыялам у гэтых адносінах валодае, безумоўна, каляндарная абраднасць з выразна аформленымі мастацкімі элементамі. Да гэтай групы належаць абрады ўсяго каляднага цыкла, уключаючы само калядаванне, святкаванне Новага года (Шчадрэц), Вадохрышча (Тры Каралі), што суправаджаюцца звычайна маскарадамі, адпаведнымі песнямі, тэатралізаванымі прадстаўленнямі, у тым ліку і батлеечнымі, спецыяльнай абрадавай ежай. Традыцыйныя вячоркі, што ладзіліся ў гэты час, валодаюць бадай што найбольшым патэнцыялам сярод усіх абрадавых элементаў для стварэння анімацыйных праграм, так як менавіта гэтыя вячоркі суправаджаліся тымі танцамі, спевамі, гульнямі тыпу “Яшчар”, “Жаніцьба Цярэшкі”, “Ката пячы”, якія атаясамліваюцца звычайна з уяўленнем пра традыцыйныя беларускія вячоркі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Тэма 6. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці  Усходняга Палесся

Гуканне вясны. Гэтае свята характэрна для Усходняй Беларусі. Як і масленкавыя абрады, песні і карагоды адбываліся на горках, бо так было бліжэй да неба. Кульмінацыя свята дасягалася 7 красавіка, калі адбываліся непасрэдна рытуальныя дз еянні і працягваліся да таго моманту, як узаруць поле. Саракі . Свята прыпадае на 22 сакавіка. Яно адзначае дзень вяснов ага раўнадзенства. З гэтым святам канчаткова прыходзіць вясна. Вялікдзень . Свята лічыцца найвялікшым каляндарным святам. Яно скл адае выключную адметнасць, самабытнасць беларускага абрадава-святочн ага каляндара. На гэтае свята сутракалі Новы Год па сонечнаму календару. Святкавалася ў дзень в ясновага раўнадзенства. Абрад “Пахаванне стралы”.  Правозіўся з мэтай выклікаць дождж і надаць зямлі ўрадлівасць. Мае язычніцкае паходжанне і, верагодна, у старажытнасці спраўляўся ў гонар Пяруна - бога маланак. Уласна ”страла” ў даўніну азначала менавіта маланку. Пасля ”Пахавання” лічылася, што вясна ўжо скончылася, і спяваць веснавыя песні болей было нельга. Штогадовы абрад «Пахавання стралы», што і сёння праводзіцца ў вёсцы Казацкія Балсуны, занесены ў Спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі.

Тэма 7. Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Заходняга Палесся

Вясельны каравай – гэта сімвал дабрабыту і шчасця маладой сям’і. Па сённяшні час у вёсцы Моталь захоўваецца старадаўні звычай выпечкі, упрыгожвання і міжродавага падзелу абрадавага хлеба – каравайная традыцыя.

Менавіта, з выпечкі каравая пачынаецца вяселле. Для гэтага спецыяльна запрашаюцца жанчыны-каравайніцы, абавязкова шчаслівыя ў шлюбе, бо лічыцца, што яны могуць сваёй энэргетыкай паўплываць на лёс маладых, перадаць ім сваю долю.

Вясновы абрадавы карагод “Стрылка”вёска Бездзеж, Драгічынскі раён, Брэсцкая вобласць. Штогод на першы дзень Вялікадня, у вёсцы Бездзеж Драгічынскага раёна, адбываецца своеасаблівы абрад, які існуе толькі ў гэтай мясцовасці. Гэта ўнікальная лакальная з’ява да якой старанна рыхтуюцца і якая з’яўляецца вельмі ўстойлівым элементам мясцовай культуры. Сутнасць вясновага абрадавага карагода “Стрылка” заключаецца ў дазволе да гулянняў пасля Вялікага паста, гэта сваеасаблівы зварот да вышэйшых сіл з надзеяй на новы багаты ўраджай, лепшую долю, шчасце і здароў’е для малых і дарослых, для ўсіх вяскоўцаў. Абрадавы карагод “Стрылка” выконвае сімвалічна-знакавую функцыю, спрыяе захаванню сваёй культурнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адметнасці і выхаванню ў новых пакаленняў паважных адносін да звычаяў продка.

Ваджэнне куста” – гэта яркая рэгіянальная адметнасць траецкага свята на Брэстчыне. Дзяўчыну ці маладую жанчыну ўпрыгожвалі зялёнымі галінкамі і вадзілі па вёсцы абыходзячы ўсе двары, спявалі абрадавыя песні ў якіх славілі гаспадароў, іх дзяцей, жадалі ім здароўя і дабрабыту. “Куста” лічылася сімвалам ураджаю. З цягам часу абрад пад уплывам сацыяльна-эканамічных фактараў трансфарміраваўся і набыў шлюбную накіраванасць і стаў надзеяй і пажаданнем добрага шлюбу.

Абрад “Намскі Вялікдзень” з’яўляецца адметным праяўленнем лакальнай культурнай традыцыі в.Аброва Івацэвіцкага раёна і праводзіцца штогод у чацвер Вялікоднага тыдня.Першы чацвер пасля Вялікадня – асаблівы дзень для Аброва, амаль ужо стагоддзе адзначаюць яшчэ адзін Вялікдзень – Намскі, што азначае “наш”, “нам дадзены”. Сёння для мясцовых жыхароў гэта радасная і ўзнёслая падзея. У дваццатыя гады мінулага стагоддзя, калі зарадзіўся гэты абрад, аброўцам было не да святаў. Пачалося ўсё з таго, што ў вёсцы сталі хварэць і паміраць дзеці. Ніхто не мог дапамагчы і не ведаў, што рабіць. І тады старыя людзі падказалі: жанчынам вёскі ноччу сабрацца ў адной хаце, напрасці нітак і саткаць з іх за адну ноч рушнік. А мужчынам у гэты час змайстраваць ківот для абраза Маці Божай, паставіць туды абраз, накрыць яго сатканым за ноч рушнікам і абысці ўсю вёску па крузе, заходзячы ў кожны двор. Так і зрабілі. І здарыўся цуд: дзеці акрыялі, мор адышоў. А жыхары вёскі з таго моманту далі сабе зарок: вось так абыходзіць вёску штогод у чацвер пасля Вялікадня, і тады ліхалецце і няшчасці будуць мінаць Аброва. Таму Намскі Вялікдзень – з так званых “заветных свят”, ці аброчных дзён, якія былі ўстаноўлены па абяцанні як падзяка або аброк Богу за дапамогу жыхарам вёскі пры ўзнікненні эпідэмій, мору і іншых няшчасцяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(дзённая форма навучання)

| Нумарр раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | |
| 1 | Асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры рэгіёнаў Беларусі | 4 | 2 | 2 | Дыскусія, адказы на пытанні |
| 2 | Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Паазер'я | 2 | 2 | 2 | Дыскусія, падрыхтоўка прэзентацый |
| 3 | Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Падняпроўя | 2 | 2 | 2 | Дыскусія, адказы на пытанні |
| 4 | Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Цэнтральнага рэгіёна | 2 | 2 | 2 | Дыскусія, адказы на пытанні |
| 5 | Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Панямоння | 2 | 2 | 2 | Адказы на пытанні |
| 6 | Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Усходняга Палесся | 2 | 4 | 2 | Дыскусія, адказы на пытанні |
| 7 | Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Заходняга Палесся | 2 | 4 | 2 | Дыскусія, адказы на пытанні |
| | УСЯГО: | 16 | 18 | 14 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

(завочная форма навучання)

| Нумарр раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі |
| 1 | Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Паазер'я і Панямоння | 2 | 2 |
| 2 | Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Падняпроўя і Цэнтральнага рэгіёна | 2 | 2 |
| 2 | Рэгіянальна-лакальныя асаблівасці Усходняга і Заходняга Палесся | 2 | 2 |
| | УСЯГО | 6 | 6 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная:*

1. Аляхновіч, А.М., Лозка, А.Ю. Веснавыя святы: Дапаможнік для настаўнікаў і выхавальнікаў. Мн.: Беларусь, 2000. – 156 с.
2. Барташэвіч, Г.А. Фальклор у сістэме выхавання // Праблемы выхавання. – 1995. – №1. – С. 70–75.
3. Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі / Склад. М.Ф. Пiлiпенка, В.К. Бандарчык і інш. Мн.: Беларуская навука, 2002. – 606 с.
4. Гуд, П.А. Народныя традыцыі ў сучасных беларускіх святах // Пазашкольнае выхаванне. – 2000. – № 2. – С. 23–26.
5. Кухаронак, Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў. Мн.: Ураджай, 2001.– 239 с.
6. Навагродскі, Т.А. Традыцыі народнага харчавання беларусаў. Мн.: НІА, 2000. – 111 с.
7. Сацыяльна-педагагічны патэнцыял беларускіх свят і абрадаў: вучэбна-метадычны дапаможнік / Аўт.-склад. Т.І.Кухаронак, В.Г.Кухаронак. – Мн.: БДПУ, 2005. – 108 с.
8. Сучкоў, І.І. Фальклорны тэатр і выхаванне асобы. Мн.:НІА, 2001. – 176 с.

**Дадатковая:**

1. Беларуская вусна-паэтычная творчасць / Склад. К.П. Кабашнікаў і інш. Мн.: Вышэйшая школа, 1988. – 415 с.
2. Беларускі музычны фальклор / Склад. А.М. Аляхновіч і інш. Мн.: Універсітэцкае, 1996. – 334 с.
3. Беларускі фальклор: Энцыклапедыя. У 2-х т. Т. 1. Мн.: БелЭн, 2005. – 756 с.; Т. 2. Мн.: БелЭн, 2006. – 828 с.
4. Беларусы. Т.5. Сям’я / Склад. М.Ф. Пiлiпенка, В.К. Бандарчык і інш. Мн.: Беларуская навука, 2001.– 375 с.
5. Беларусы. Т.7. Вусная паэтычная творчасць / Склад. М.Ф. Пiлiпенка, В.К. Бандарчык і інш. Мн.: Беларуская навука, 2004. – 586 с.
6. Гульні, забавы, ігрышчы / Склад. А.Ю.Лозка. Мн.: Беларуская навука, 1996. – 532 с.
7. Гурскі, А.І. Бяздоннае багацце. Легенды,паданні. Мн.: Мастацкая літаратура, 1990. – 255 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Крук, І.І. Следам за сонцам: Беларускі народны каляндар. Мн.: Ураджай, 1998. – 214 с.

9. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: канец XIX – XX ст. Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 124 с.

10. Ліцьвінка, В.Дз. Святы і абрады беларусаў. Мн.: Беларусь, 2001. – 188 с.

11. Сахута, Я.М. Народнае мастацтва Беларусі. Мн.: БелЭн, 1997. – 286 с.

12. Скорабагатчанка, А. Беларускія народныя музычныя інструменты XX ст. Мн.: Беларуская навука, 2001. – 397 с.

13. Сысоў, У.М. З крыніц спрадвечных. Мн.: Вышэйшая школа, 1997. – 415 с.

14. Цітоў, В.С. Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Краіна і людзі: Вучэбн.метад.дапаможнік. Мн.: Беларусь, 2001. – 207 с.

КАНТРОЛЬ ВЕДАЎ МАГІСТРАНТАЎ

Прыкладны пералік пытанняў да заліку

12. Гісторыка- этнаграфічны падзел Беларусі.
13. Легенды і паданні і іх сацыялькультурны змест.
14. Сацыякультурны патэнцыял народных былічак, вусных апавяданняў, анекдотаў, жартаў, прыкмет і павер'яў.
15. Сацыякультурны патэнцыял беларускіх народных прыказак і прымавак.
16. Калядны цыкл народнага календара беларусаў: сацыякультурны патэнцыял.
17. Веснавыя святы і абрады беларусаў і іх сацыякультурны патэнцыял.
18. Сацыякультурны патэнцыя летніх свят і абрадаў.
19. Восеньскія святы і абрады і іх сацыякультурны патэнцыял.
20. Сацыякультурны патэнцыял сямейных звычаяў і абрадаў беларусаў.
21. Шляхі выкарыстання рэгіянальных асаблівасцей сямйных і каляндарных свят у сучаснай СКД.

**Сродкі дыягностыкі ведаў магістрантаў**

Для выяўлення ўзроўня вынікаў навучання студэнтаў могуць выкарыстоўвацца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. Адказы на пытанні падчас практычных заняткаў;
2. Дыскусіі па праблемных пытаннях;
3. Выступленне з дакладамі на практычных занятках на абраныя тэмы;
4. Падрыхтоўка мультымедыйных прэзентацый.

**Прыкладны пералік формаў/заданняў для кантралюемай самастойнай работы**

**Тэма: Асаблівасці выкарыстання рэгіянальных гульняў і забаваў Паазер'я ў сучасным працэсе СКД**

Падрыхтаваць рэфераты (акцэнтаваць лакальна-рэгіянальны аспект):

Каляндарныя гульні і забавы

Сямейныя гульні і забавы

**Тэма: Асаблівасці выкарыстання рэгіянальных гульняў і забаваў Падзвіння ў сучасным працэсе СКД**

Падрыхтаваць рэфераты (акцэнтаваць лакальна-рэгіянальны аспект):

Каляндарныя гульні і забавы

Сямейныя гульні і забавы

**Тэма: Асаблівасці выкарыстання рэгіянальных гульняў і забаваў ЦэнтральнайБеларусі ў сучасным працэсе СКД**

Падрыхтаваць рэфераты (акцэнтаваць лакальна-рэгіянальны аспект):

Каляндарныя гульні і забавы

Сямейныя гульні і забавы

**Тэма: Асаблівасці выкарыстання рэгіянальных гульняў і забаваў Усходняга і Заходняга Палесся ў сучасным працэсе СКД**

Падрыхтаваць рэфераты (акцэнтаваць лакальна-рэгіянальны аспект):

Каляндарныя гульні і забавы

Сямейныя гульні і забавы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ